# "Не прапусціць гэтае вясёлае мерапрыемства",

## або Сустрэчы выпускнікоў у пачатку XX стагоддзя

***Штогод, у першую суботу лютага, усе навучальныя ўстановы Беларусі адкрываюць дзверы для сваіх выхаванцаў, якія сталі ўжо дарослымі. Памужнелых выдатнікаў, сераднякоў і двоечнікаў, актывістаў, ціхонь і гарэз, якія вырашылі акунуцца ў атмасферу бесклапотнага дзяцінства і юнацтва, чакаюць іх настаўнікі, а таксама родныя кабінеты і канцэрт.***

Сама традыцыя гэтага свята была закладзена яшчэ ў XIX стагоддзі ў легендарным "пушкінскім" Царскасельскім ліцэі, а першае згадванне адносіцца да 19 кастрычніка 1827 года. Прайшоў час, і свята стала настолькі папулярным, што з'яўляецца неад'емнай часткай жыцця кожнай навучальнай установы, у тым ліку ў Беларусі. Вось толькі для зручнасці Дзень сустрэчы выпускнікоў стаў праводзіцца ў дні зімовых канікул студэнтаў, калі яны пасля здачы экзаменаў прыязджаюць дадому.

Пры знаёмстве з жыццём нашага горада з дапамогай штодзённай грамадска-палітычнай і літаратурнай газеты "Наша раніца", якую да Першай сусветнай вайны можна было набыць за 2 капейкі, было вельмі цікава адзначыць для сябе і расказаць вам, паважаныя чытачы, як праходзіў дзень выпускніка ў Гродне ў 1913 годзе.

У пачатку XX стагоддзя ў Гродне не было вышэйшых устаноў адукацыі, як і ва ўсёй Беларусі, таму студэнты-гродзенцы вымушаны былі вучыцца ў Маскве, Юр'еве (цяпер Тарту), Варшаве і іншых універсітэцкіх гарадах. Найбольш прадстаўнічая і значная частка гродзенцаў вучылася ў Санкт-Пецярбургу, утварыўшы там так званае гродзенскае зямляцтва пры мясцовым універсітэце. Прыязджаючы на пабыўку ў зімовыя канікулы пад бацькоўскі прытулак, моладзь выкарыстоўвала гэты час для правядзення штогадовых студэнцкіх вечароў.

У адрозненне ад нашых дзён, у тую пару падобныя мерапрыемствы ладзіліся не ўстановамі адукацыі. Вечар быў адзіным і праходзіў на "вольнай тэрыторыі". Пры гэтым арганізатарамі свята выступалі студэнты і іх бацькі. Само мерапрыемства мела яшчэ адну вельмі важную мэту — дабрачынную. Ненадакучліва, выкарыстоўваючы розныя прыёмы, праз продаж напояў, прысмакаў, праграмак ішоў збор грошай на карысць малазабяспечаным студэнтам, якія не мелі сродкаў для працягу навучання. Падрыхтоўка свята шырока анансавалася на старонках газеты, таксама па горадзе былі расклеены афішы з запрашэннем "не прапусціць гэтае вясёлае мерапрыемства, якіх у Гродне не так шмат".

Адзінага, пастаяннага месца для правядзення вечара не было. У студзені 1913 года ім упершыню стаў Ваенны сход гродзенскага гарнізона (будынак Старога замка). Арганізатары наогул запланавалі ў тым годзе здзівіць усіх небывалай урачыстасцю, ператварыўшы мерапрыемства ў вясёлы баль-карнавал пад назвай "П'еро і Каламбіна". Па гэтай прычыне значная частка моладзі была апранута ў белыя касцюмы з жабо і пышныя сукенкі гэтых папулярных герояў італа-французскіх народных тэатраў.

Памяшканні Ваеннага сходу па прычыне свята былі аформлены ў жанры італьянскай кірмашовай плошчы з абавязковай карчмой. У ролі прадаўцоў выступалі ў асноўным бацькі студэнтаў, сярод якіх былі прадстаўнікі самых высокіх слаёў гарадскога насельніцтва. Напрыклад, сярод прадаўцоў шампанскага нястомныя рэпарцёры заўважылі жонку гаспадара тытунёвай фабрыкі Шарашэўскага. А вось марожаным паспяхова гандлявала жонка генерала М.Н.Кайгародава, які камандаваў 26-й пяхотнай дывізіяй.

Праграма свята была насычана нумарамі запрошаных артыстаў з гродзенскага тэатра: пантаміма, танцы, урыўкі са знакамітай оперы "Паяцы". Знаходзілася месца на вечары і народнай батлейцы, якая, праўда, чамусьці не вельмі карысталася папулярнасцю сярод удзельнікаў свята, як піша газета. Пасля паказу пачыналіся танцы. І калі спачатку моладзь танцавала вяла, то да канца вечара "моцна ажывілася і... стала непадроблена весела і шумна". Сярод танцаў тады быў вельмі модны і папулярны кекуок, які праходзіў пад акампанемент банджа, гітары — папярэднік рэгтайма з яго рытмічнымі рухамі.

У цэлым свята прайшло на славу. Але, як адзначала прэса, усё ж не стала такім масавым, як чакалі арганізатары. За вечар было сабрана 605 рублёў 53 капейкі, з якіх на арганізацыю, афармленне мерапрыемства, аплату артыстаў пайшло 294 рублі і 54 капейкі. Такім чынам, чысты прыбытак склаў 310 рублёў 96 капеек — сума на той час больш чым прыстойная. Гэтыя грошы праз гарадскую адміністрацыю былі пералічаны на карысць гродзенскага зямляцтва Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта для дапамогі немаёмным студэнтам.

Вось такім атрымаўся вечар сустрэчы студэнтаў у Гродне 12 студзеня 1913 года. Наперадзе ў маладых людзей была вучоба і яшчэ адно свята ў пачатку 1914 года. А далей пачалася вайна, затым рэвалюцыя і зноў вайна, якія перакрэслілі іх лёсы, амаль цалкам сцерлі памяць пра гэтыя цёплыя мерапрыемствы. І толькі пажоўклыя старонкі газет даюць нам магчымасць даведацца пра дзень выпускнікоў мінулай эпохі.

**Дзяніс ТАРАСЮК,**
**настаўнік гісторыі гімназіі № 1 імя акадэміка Я.Ф.Карскага Гродна.**